


COVID
-19

DRI

BY

РЭЗЮМЭ

# КАРОНАВІРУСНЫ КРАШ-ТЭСТ: УСТОЙЛІВАСЦЬ ПЕРАД ДЭЗІНФАРМАЦЫЯЙ У КРАІНАХ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА І РУМЫНІІ

KYIV, 2020

# РЭЗЮМЭ


У даследаванні прадстаўлены агляд дзеянняў і камунікацыйных стратэгій, звязаных з COVID-19, а таксама наратываў дэзінфармацыі ў шасці краінах Усходняга партнёрства (Азербайджан, Арменія, Беларусь, Грузія, Малдова і Украіна) і Румыніі. Гэта лагічны працяг і сутнаснае дапаўненне "Індэкса ўстойлівасці да дэзінфармацыі 2018", апублікаванага Саветам па знешняй палітыцы «Украінская прызма».

Мэта гэтага даследавання – правесці «краш-тэст» некаторых гіпотэз, зробленых у 2018 годзе нацыянальнымі экспертамі, і прааналізаваць, як развіваецца ўстойлівасць дзяржаў да дэзінфармацыі. Моцная хваля дэзінфармацыі, звязаная з пандэміяй COVID-19, стала выпрабаваннем на ўстойлівасць да дэзінфармацыі. Акрамя таго, даследаванне накіравана на павышэнне дасведчанасці шырокай аўдыторыі аб магчымых пагрозах дэзінфармацыі, звязанай з COVID-19, і адпавденай ўстойлівасцю дзяржаваў.

Звычайна дзяржавы ў сувязі з успышкамі каронавіруса сканцэнтраваныя на кіраванні гуманітарнымі справамі і сістэмай аховай здароўя, аднак інфармацыйная сфера таксама знаходзіцца ў напружаным стане. Як вынікае з нашага аналізу, крыніцы дэзінфармацыі могуць быць рознымі (як унутранымі, так і замежнымі), але іх наступствы падобныя і могуць выклікаць паніку, недавер да дзяржаўнай дзейнасці і няправільныя дзеянні з сувязі з крызісам.

Лагічная аснова аналізу пабудавана вакол трох асноўных кампанентаў: частка, прысвечаная краінам, наратывы дэзінфармацыі і Індэкс. Мясцовыя эксперты ў сямі краінах прааналізавалі дзеянні, заявы і ініцыятывы як урадавых, так і няўрадавых інстытуцый, уключаючы сродкі масавай інфармацыі і рэлігійныя арганізацыі, а таксама наратывы, прадстаўленыя ў грамадскім і медыйным дыскурсе на працягу 6 месяцаў (люты-ліпень 2020).

Аналіз паказаў, што хоць ў большасці краін першыя выпадкі заражэння COVID-19 былі выяўлены ў сакавіку, дэзінфармацыя і канспіратыўныя тэорыі распаўсюджваліся пачынаючы са студзеня-лютага. Гэтыя наратывы дэзінфармацыі былі часткай глабальнай тэндэнцыі і мелі ў асноўным геапалітычны характар, звязаны з дыскурсам Кітая і ЗША альбо страхам перад невядомым.

Вынікі даследавання паказалі, што ўвядзенне надзвычайнага становішча амаль не аказала ніякага ўплыву на распаўсюджванне дэзінфармацыі. Адзін з галоўных фактараў, які ўплывае на паток дэзінфармацыі – своечасовая, дастатковая і скаардынаваная падача інфармацыі адпаведнымі дзяржаўнымі органамі. Як толькі сродкі масавай інфармацыі і грамадскасць атрымлівалі адкрыты доступ да інфармацыі праз рэгулярныя брыфінгі, афіцыйныя сайты і г.д., інфармацыйны вакуум запаўняўся, і заставалася менш месца для плётак і маніпуляцый.

Медыя адыгралі сур'ёзную ролю як у распаўсюджванні дэзінфармацыі, гэтак і ў яе развянчанні. На жаль, у некаторых краінах медыя сталі закладнікамі палітычных пераваг уладальнікаў, альбо, на пачатковым этапе, адсутнасці канкрэтных ведаў, неабходных для асвятлення пандэміі. Сітуацыя была лепшай у краінах з Кодэксам паводзін і нормамі самарэгулявання СМІ, і адначасова была больш складанай у тых краінах, дзе СМІ кантраляваліся пераважна дзяржавай.

Усе краіны сутыкнуліся з праблемай балансавання паміж неабходнасцю прадухіляць распаўсюджванне дэзінфармацыі, блакуючы некаторыя навінавыя альбо інтэрнэт-рэсурсы, якія іх распаўсюджваюць, і правам на свабоду слова і дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі. Аднак узровень крытыкі ўрада, магчыма, суадносіўся з узроўнем дэмакратыі ў адпаведных краінах і даверам да дзяржаўных дзеянняў. Напрыклад, у Азербайджане і Беларусі раней было шмат выпадкаў злоўжывання ўладай і выкарыстання блакіровак ў якасці пакарання для апазіцыі, таму любыя новыя абмежаванні ўспрымаліся праз прызму дадатковага ціску. У той час як ва Украіне грамадскасць прызнала неабходнасць службам бяспекі блакаваць некаторыя старонкі Facebook у якасці патрэбнага кроку для прадухілення распаўсюджвання дэзінфармацыі, паколькі раней такія дзеянні ў асноўным былі звязаны з прадухіленнем расійскай альбо сепаратысцкай прапаганды.

Румынія, Украіна і Грузія занялі найвышэйшае месца па ўстойлівасці, грамадскай і дзяржаўнай рэакцыі, хаця да гэтага

часу не дасягнулі вышэйшай адзнакі. Адначасова Азербайджан, Беларусь і Малдова атрымалі самыя нізкія балы. Па дзяржаўнай рэакцыі Грузія атрымала найлепшы вынік (6 з 9), затым Украіна (5 з 9), а Малдова – самы нізкі (0). Дзейнасць медыя была лепшай у Румыніі (3 з 4) і горшай ў Беларусі (1 з 4). Рэакцыя грамадзянскай супольнасці была найбольш актыўнай ва Украіне і Румыніі (7 з 8 для абедзвюх краін) і найменш актыўнай у Азербайджане і Беларусі (1 з 8 для абедзвюх краін).

## НАРАТЫВЫ

Як паказала даследаванне, у той час як расійскія наратывы нязменна займаюць публічны дыскурс, падчас пандэміі Расійская Федэрацыя не была адзінай крыніцай дэзінфармацыі, пакідаючы дастаткова месца для стварэння глабальных і мясцовых наратываў. І ўсё ж рускамоўнае насельніцтва заставалася найбольш уразлівым для дэзінфармацыі.

Большасць наратываў дэзінфармацыі, распаўсюджаных падчас пандэміі і выяўленых ва ўсіх вывучаных краінах, можна згрупаваць наступным чынам:

- звязаныя са здароўем (напрыклад, сімптомы, дыягназ, лячэнне);
- звязаныя з геапалітыкай (напрыклад, дзеянні ці ўплыў трэціх дзяржаў, звязаныя са знешняй палітыкай, знешняй дапамогай);
- звязаныя з уладамі (напрыклад, пагрозы дэмакратыі і правам чалавека, «недзеяздольныя» урады, палітычныя расколы і г.д.);
- канспіратыўныя тэорыі (напрыклад, сеткі 5G, вірус як мэтанакіравана створаная біялагічная зброя, вірус, вынайдзены Білам Гейтсам і г.д.).

## АЗЕРБАЙДЖАН

У Азербайджане кампаніі дэзінфармацыі мелі карані як на глабальным, гэтак і на нацыянальным узроўнях, у той час як улады ў значнай ступені неправільна абышліся з сітуацыяй. Інфармацыя дзяржаўных СМІ і даследчых цэнтраў з Расіі застаецца асноўнай крыніцай дэзінфармацыі па COVID-19 для рускамоўнай супольнасцю як найбольш уразлівай групы ў краіне. Незалежныя медыя і грамадзянская супольнасць былі надзвычай абмежаваныя ў сувязі з агульнай палітычнай сітуацыяй у краіне. Строгія абмежавальныя меры, уведзеныя уладамі, моцна крытыкаваліся і не аказалі станоўчага ўплыву на ўстойлівасць азербайджанскага грамадства да дэзінфармацыі. Нягледзячы на тое, што высокапастаўленыя урадоўцы прадастаўлялі факты і асноўную інфармацыю, ім не хапала адкрытасці да пытанняў медыя і грамадзянскай супольнасці, што стварала інфармацыйны вакуум. Першапачатковая блытаніна адносна правядзення рэлігійных сходаў не прывяла да ўвядзення грамадства ў зман. Рэлігійныя супольнасці, у тым ліку іх лідары, не былі актыўнымі а ні ў інфармацыйным дыскурсе, а ні ў распаўсюдзе дэзінфармацыі. Асноўныя наратывы мяняліся з развіццём пандэміі, пачынаючы ад геапалітычных (паведамленні пра стварэнне COVID-19 Злучанымі Штатамі як біялагічнай зброі і развале ў Еўразвязе) да таго, што падчас піку пандэміі цвердзілася, быццам улады “паспяхова” змагаюцца з пандэміяй, а ў свеце вывучаюць гэты “азербайджанскі досвед” барацьбы з каранавірусам.

## АРМЕНІЯ

Арменія сутыкнулася з сур’ёзным шэрагам антыўрадавых наратываў, звязаных з агульнай палітычнай канкурэнцыяй у краіне, калі дэзінфармацыя ў асноўным распаўсюджвалася палітычнымі апанентамі, каб падарваць давер да армянскага ўрада. Першапачаткова ўрад адказаў прызначэннем віцэ-прэм’ера цэнтральнай фігурай, “адказным чалавекам”, і таксама сістэматычнымі абнаўленнямі інфармацыі ад Міністэрства аховы здароўя. Рэгулярныя брыфінгі пазітыўна ўплывалі на запаўненне інфармацыйнага вакууму. Аднак праблемы няправільных дзеянняў падчас пандэміі і прыватнасці дадзеных адцянілі першапачатковы станоўчы уплыў. Высокая палітызаванасць медыйнага ландшафту ў Арменіі мела негатыўны эфект. У сацыяльных сетках істотны ўплыў мелі (былыя) лекары – блогеры, якія змешвалі палітыку і медыцыну і распаўсюджвалі дэзінфармацыю пра вірус. Грамадзянская супольнасць мела як станоўчы, так і адмоўны ўплыў і ўдзельнічала як у распаўсюдзе дэзінфармацыі, гэтак і ў яе выкрыцці. Асноўныя наратывы, папулярныя ў Арменіі, – гэта крытыка масак і каранцінных мер, фарміраванне недаверу да ўрада, размовы аб ролі Джорджа Сораса ў распаўсюджванні віруса.

## БЕЛАРУСЬ

Беларусь асаблівая тым, што гэта адзіная краіна, дзе не былі ўведзеныя каранцін альбо надзвычайнае становішча. Акрамя таго, пандэмія развівалася разам з вельмі напружанай выбарчай кампаніяй. Такім чынам, урад і самі вышэйшыя чыноўнікі сталі адной з асноўных крыніц дэзінфармацыі разам з расійскімі інфармацыйнымі крыніцамі. На першым этапе распаўсюджвання пандэміі інфармацыйная палітыка Мінска была ў асноўным сканцэнтравана на прадухіленні панікі сярод насельніцтва шляхам публікацыі вельмі абмежаваных дадзеных аб эпідэміялагічнай сітуацыі і прыніжэння рызыкі заражэння. Прэзідэнт Лукашэнка стаў галоўнай крыніцай ілжывай інфармацыі. Гэта прывяло да інфармацыйнага вакууму і распаўсюджвання плётак пра рэальную сітуацыю вакол COVID-19. Незалежныя медыя і апазіцыйныя палітыкі крытыкавалі дзеянні ўрада і спрабавалі прадставіць альтэрнатыўныя крыніцы інфармацыі. Гэта было выкарыстана як прычына для нападаў на апазіцыйныя медыя. У сітуацыі адсутнасці каранціну ў Беларусі, арганізацыі і ініцыятывы грамадзянскай супольнасці ўдзельнічаюць у адвакатаванні больш жорсткіх мер сацыяльнага дыстанцыявання і падтрымкі медыцынскага персаналу і лякарнях, чым у развянчанні прапаганды. Асноўныя наратывы былі прысвечаныя адмаўленню небяспекі COVID-19, геапалітычнай канкурэнцыі паміж Кітаем і ЗША як прычыне крызісу і чуткам пра высокую смяротнасць у розных гарадах.

## ГРУЗІЯ

Рэакцыя уладаў Грузіі была адной з самых паспяховых, што прывяло як да лепшай сітуацыі з пандэміяй, гэтак і да добрых камунікацыйных стратэгій. Аднак палітычны крызіс і чаканыя парламенцкія выбары падчас пандэміі негатыўна паўплывалі на інфармацыйнае асяроддзе. Самым вялікім выклікам для Грузіі стала тлумачэнне каранцінных мер і іншых абмежаванняў нацыянальным меншасцям (азербайджанскай і армянскай абшчынам), што прывяло да шэрагу інцыдэнтаў. Стварэнне ўрадам Грузіі Міжведамаснага каардынацыйнага савета мела свой станоўчы эфект з улікам прадстаўлення важнай інфармацыі, штодзённых брыфінгаў, стварэння адмысловых вэб-сайтаў і гарачай лініі. Што тычацца медыя, то крыніцай праблемы былі расійскія СМІ і акупаваныя тэрыторыі Грузіі, якія пераказвалі расійскую дэзінфармацыю. Большая частка гэтай дэзінфармацыі была звязана з фальшывымі навінамі пра амерыканскія лабараторыі ў Грузіі, якія нібыта «стварылі COVID-19». Антыамерыканскія, антыліберальныя і антыкаранцінныя наратывы былі найбольш папулярнымі.

## МАЛДОВА

У Малдове рэакцыя на пандэмію, а таксама яе асвятленне ў медыя былі вельмі палітызаванымі. Агульная палітычная канкурэнцыя ў краіне мела негатыўны ўплыў і прывяла да павелічэння ўзроўню дэзінфармацыі і маніпуляцый. Былі заўважаныя расейскія і кітайскія кампаніі па дэзінфармацыі. Прадстаўлены ў сакавіку “План рэагавання Малдовы” меў камунікацыйны кампанент, які ўключаў медыяі і сацыяльныя сеткі, брыфінгі найвышэйшых чыноўнікаў, прамыя лініі і вэб-сайты. Камунікацыя аб сітуацыі з COVID-19 у краіне вялася два разы на дзень ад імя аператыўнай групы па пандэміі. Аднак агульны нізкі давер малдоўскага насельніцтва да свайго ўрада і нестыкоўка прадстаўленай інфармацыі з рэальнымі фактамі на месцах прывялі да негатыўнага ўспрымання афіцыйнай інфармацыі. Акрамя таго, прэзідэнт і ўрад прадастаўлялі супярэчлівую інфармацыю. Што тычацца медыя, сур’ёзны негатыўны эфект мела значная прысутнасць расійскіх СМІ, у прыватнасці тэлеканалаў, якія распаўсюджвалі як ілжывыя навіны, гэтак і прапаганду. Царква была адной з крыніц дэзінфармацыі, у тым ліку распаўсюду фэйкаў пра 5G і паходжанне віруса (большасць наратываў былі ідэнтычныя тым, якія распаўсюджва Руская праваслаўная царква). Асноўныя наратывы ў Малдове былі прысвечаныя метадам лячэння, жахам немагчымасці выздараўлення, а таксама канспіралагічным тэорыям (чыпаванне насельніцтва, 5G, лабараторыі ЗША). Акрамя таго, прысутнічаў геапалітычны дыскурс – пераважна пра тое, што “смерць прыйшла з Захаду, а дапамога прыходзіць з Расіі і Кітая”.

## РУМЫНІЯ

Сутыкнуўшыся з перспектывай пандэміі COVID-19, румынскім уладам удалося скампанаваць комплекс мер па прадухіленні распаўсюджвання віруса і імкнуцца інфармаваць насельніцтва аб узрастанні рызыкаў. Тым не менш, рэакцыя грамадства была неадназначнай, паколькі дзеянні ўладаў выклікалі здзіўленне ў часткі насельніцтва. На гэтым фоне румынская інфармацыйная прастора зазнала паслядоўныя хвалі дэзінфармацыі. Сярод наратываў найбольш папулярнымі ў Румыніі былі канспіратыўныя тэорыі, звязаныя з паходжаннем віруса і шкоднасным уздзеяннем сетак 5G. Адной з найбольш прыкметных крыніц дэзінфармацыі сталі сайты, якія паходзяць з Малдовы. Даследаванне прыйшло да высновы, што лічыць Расію адзінай крыніцай кампаній дэзінфармацыі, якія абрынуліся на Румынію, было б занадта спрошчаным: мясцовыя стуктуры без дакладных сувязей з Расійскай Федэрацыяй таксама могуць быць зацікаўлены ў распаўсюджванні дэзінфармацыі і альтэрнатыўных наратываў для аналагічных мэтаў: аслабіць давер да інстытутаў і пасеяць паніку.

## УКРАІНА

Маніпуляванае інфармацыяй, з выкарыстаннем спалучэння эмацыянальнасці і рацыянальнасці, стала распаўсюджаным і дамінуючым ва Украіне з 2014 года і выкрышталізавалася ў перыяд пандэмічнага крызісу 2020 года. Аэўную ўстойлівасць украінцаў да дэзінфармацыі і фэйкавых навін забяспечыў досыць вялікі досвед інфармацыйнай вайны з Расіяй, а таксама наяўнасць шэрагу няўрадавых арганізацый, якія спецыялізуюцца на выкрыванні фэйкаў і інфармацыйнай бяспеке. Рэакцыя ўрада была здавальняючай, дзякуючы штодзённай інфармацыі і стварэнню адмысловых вэб-сайтаў. Службы бяспекі таксама ўдзельнічалі ў прадухіленні распаўсюджвання дэзінфармацыі, асабліва ў сацыяльных сетках. Медыя выглядалі менш устойлівымі з-за некалькіх фактараў: палітызаванасці медыя-ландшафту, недахопу прафесійных ведаў, уплыва Расіі і спасылак на неправераныя невядомыя крыніцы. У той жа час былі станоўчыя прыклады, калі медыя адмыслова запаўнялі інфармацыйныя прабелы і развенчвалі міфы пра COVID-19.

Грамадзянская супольнасць ва Украіне стала самай устойлівай і падрыхтаванай, актыўна працавала па ўсіх напрамках: прадастаўляла адэкватную інфармацыю, развенчвала міфы, правярала факты і г.д. Распаўсюджванне дэзінфармацыі ва Украіне адрознівалася ў залежнасці ад сітуацыі. Усё ачалося з фальшывых навін і канспіратыўных тэорый з-за недахопу ведаў, у дадатак да геапалітычных наратываў пра замежную падтрымку ў барацьбе з пандэміяй. Самая папулярная дэзінфармацыя – пра паходжанне віруса (у тым ліку “амерыканскія лабараторыі ва Украіне”) і пра метады лячэння, а таксама пра ролю Джорджа Сораса ў выкліканні пандэміі.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ

Экспертамі распрацаваныя наступныя рэкамендацыі, якія могуць быць ужытыя не толькі ў асобных краінах, але і ва ўсім рэгіёне.

1. Эфектыўная каардынацыя паміж міністэрствамі і ведамствамі пры прадастаўленні інфармацыі, каб павялічыць даваер і пазбегнуць непаразуменняў і навінаў, якія могуць увесці ў зман.

2. Забеспячэнне на дзяржаўным узроўні доступа грамадзян да поўнай, праўдзівай і своечасовай інфармацыі пра пандэмію. Інфармацыя мусіць быць лёгка датсупнай як унутры краіны, так і за яе межамі, у тым ліку на мовах нацыянальных меншасцей.

3. Узаемны давер мае важнае значэнне для забеспячэння згуртаванасці і адзінства на грамадскім узроўні. І наадварот, больш нізкі ўзровень даверу паміж дзяржаўнымі інстытутамі і грамадзянскай супольнасцю ўплывае на ўстойлівасць дзяржавы.

4. Для барацьбы з дэзінфармацыяй неабходна заахвочваць прафесійную праверку фактаў і выкрыццё фэйкаў, асабліва ў інтэрнэт-асяроддзі.

5. У дадатак да выкрыцця самой дэзінфармацыі трэба выкарыстоўваць метад »Імя і ганьба« для выкрыцця тых, хто распаўсюджвае дэзінфармацыю. Патрэбныя адпаведныя меры для прадухілення выпадкаў дэзінфармацыі ў будучыні.

# COVID-19 DISINFORMATION RESPONSE INDEX

COVID-19 Disinformation Response Index

A

**Government Response (maximum 9)**

Governmental activities on informing the public and media, fighting disinformation, cooperating with civil society that could either positively or negatively influence the spread of COVID-19 related disinformation.

B

**Media Response (maximum 4)**

Measures taken by the state and independent media to counter COVID-19 related disinformation and ensure spread of evidence-backed information.

C

**Society Response (maximum 8)**

Actions by civil society (formal organizations and informal initiatives) to counter COVID-19 related disinformation, ensure spread of evidence-backed information




Government Response



Poor Efficient

A

Moldova

Belarus
Azerbaijan
Romania
Armenia

Ukraine
Georgia

Media Response



Poor Efficient

B

Belarus

Armenia
Azerbaijan
Georgia
Moldova
Ukraine

Romania

Society Response



Poor Efficient

C

Azerbaijan
Belarus

Armenia
Georgia
Moldova

Romania
Ukraine

**Coordinator:**

Olga Chyzhova

**Editor:**

Hanna Shelest, PhD

# AUTHORS:

**Richard Giragosian**, Regional Studies Center, Armenia

**Najmin Kamilsoy**, Charles University, Azerbaijan

**Dzianis Melyantsou**,Minsk Dialogue Council on International Relations, Belarus

**Lasha Tughushi**, PhD, Liberal Academy Tbilisi, Georgia

**Natalia Stercul**, PhD, Foreign Policy Assosiation of the Republic of Moldova, Moldova

**Teodor Lucian Moga**, PhD, Centre for European Studies, Faculty of Law, Alexandru Ioan Cuza University of Iasi, Romania

**Sergiy Gerasymchuk**, **Oleksanrd Kraiev**, Foreign Policy Council “Ukrainian Prism”, Ukraine

The research  was carried out in Summer, 2020 by the Foreign Policy Council “Ukrainian Prism” (www.prismua.org) in the framework of the project “Coronavirus crush test: Disinformation Resilience of EaP states and Romania”, supported by the Black Sea Trust for Regional Cooperation, a Project of the German Marshall Fund of the United States. Opinions expressed in this publication do not necessarily represent those of the Black Sea Trust or its partners.

UKRAINIAN PRISM

COVID-19 DRI Disinformation Response Index